WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

12 ЛЮТАГА 2011 г.
СУБОТА
№ 28
(26892)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Прамая лінія

## БЕЗ НЕЎРЫТАЎ, НЕЎРАЛГІЙ І РАДЫКУЛІТАЎ

Тэмай нашай чарговай «прамой лініі» стануць пытанні лячэння і прафілактыкі хвароб неўралагічнага профілю: радыкулітаў, неўрытаў, неўралгій, сасудзістых захворванняў галаўнога мозга і г.д. Чытачам будзе адказваць **загадчык неўралагічнага аддзялення мінскай 10-й гарадской клінічнай бальніцы, кандыдат медыцынскіх навук Аляксандр Віктаравіч ІВАНОЎ**.

«Прамая лінія» адбудзецца **17 лютага, у чацвер з 17.00 да 18.00** па нумарах: **8 (017) 292 38 92 і 292 38 21. Папярэднія пытанні можна задаваць па нумарах: 8 (017) 287 18 29 і 287 18 36.**

## ЦЭНЫ НА ВАЖНЕЙШЫЯ САЦЫЯЛЬНА ЗНАЧНЫЯ ТАВАРЫ ЗНАХОДЗЯЦЦА ПАД КАНТРОЛЕМ

**Дзяржава кантралюе і пастаянна адсочвае сітуацыю з цэнамі на важнейшыя сацыяльна значныя тавары. Аб гэтым заявіў міністр гандлю Беларусі Валянцін Чаканаў у час прыёму грамадзян у Віцебску, перадае БЕЛТА.**

«Нельга сказаць, што цэны на гэтыя тавары не будуць расці, але яны будуць узнімацца значна павольней і пад кантролем дзяржавы», — адзначыў міністр, падкрэсліўшы, што размова ідзе менавіта аб сацыяльна значных таварах. Што датычыцца іншых відаў тавараў, то ў Беларусі дзейнічае свабоднае цэнаўтварэнне.

Між тым сёння рост цэн на прадукты харчавання з'яўляецца агульнасусветнай тэндэнцыяй. «Калі ў сумежных краінах цана, напрыклад, на цукар вышэйшая, чым у Беларусі, то пачынаецца вываз тавару, што ў сваю чаргу вымушае нас прымаць рашэнне аб павышэнні цэн», — растлумачыў Валянцін Чаканаў.

Тое ж самае можна сказаць пра грэчку, павелічэнне цаны на якую хвалявала віцябчанку, якая пазваніла на прамую лінію. Кіраўнік Мінгандлю растлумачыў, што беларуская грэчка забяспечвае патрэбнасці рэспублікі ў гэтым відзе круп на 30 працэнтаў, астатняе імпартуецца, а ў асноўных краінах яе вырошчвання (Расія, Украіна) з-за ўмоў надвор'я быў недабор, і там вымушаны прымаць меры па абароне свайго рынку. «На жаль, калі мы бачым у суседніх краінах павышэнне цаны на які-небудзь від тавару, то для прадухілення яго некантралюемага вывазу з нашага рынку вымушаны таксама павышаць цану, але ў той жа час па ўзроўні цэн мы не даганяем ні Расію, ні Украіну, ні краіны Прыбалтыкі», — адзначыў Валянцін Чаканаў. Ён таксама дадаў, што насычэнне таварамі гандлёвых сетак ва ўсіх рэгіёнах краіны знаходзіцца на пастаянным кантролі Мінгандлю.

## РАДАСЦЬ СУСТРЭЧЫ З ЦУДОЎНЫМІ БЕЛАРУСКІМІ МЕЛОДЫЯМІ

**Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка павіншаваў з 70-годдзем мастацкага кіраўніка Нацыянальнага акадэмічнага народнага хору Рэспублікі Беларусь імя Г.І. Цітовіча народнага артыста Міхаіла Дрынеўскага.**

«Дзякуючы Вашаму таленту, майстэрству, нястомнай працы, вялікай любові да роднага слова і песні Нацыянальны акадэмічны народны хор Рэспублікі Беларусь з'яўляецца адной са скарбніц айчыннай культуры. Калектыў пад Вашым кіраўніцтвам працягвае свае слаўныя традыцыі, пастаянна павышае творчы ўзровень і дорыць слухачам усяго свету радасць сустрэчы з цудоўнымі беларускімі мелодыямі», — адзначыў Прэзідэнт Беларусі.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## У МІНСКУ — 1 МЛН 864 ТЫС. ЧАЛАВЕК

У 2010 годзе памерла 18,2 тыс. мінчан. Асноўная прычына — хваробы сістэмы кровазвароту (57,3% ад агульнай колькасці памерлых). На другім месцы — новаўтварэнні (19,1%), на трэцім — няшчасныя выпадкі, атручэнні, траўмы і іншыя знешнія ўздзеянні (9,6%). Натуральны прырост насельніцтва за мінулы год склаў 3 тыс. чалавек. Летась у сталіцы зарэгістравана 16 018 шлюбаў, разводаў — 8230.

**Святлана ФРАЛЯНКОВА, «Мінск — Навіны».**

## ВЕЧНЫЯ СПАДАРОЖНІКІ СВЯТОГА ВАЛЯНЦІНА



Мінскія студэнты Вова і Маша.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## НА НАСТУПНЫМ ТЫДНІ МОЦНЫЯ МАРАЗЫ, МЕСЦАМІ ДА МІНУС 32

**Сёння на тэрыторыі Беларусі ўсталююцца даволі складаныя ўмовы надвор'я, якія прынёс да нас яшчэ ў пятніцу Атлантычны цыклон «Олаф», паведаміў рэдакцыі начальнік службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый РАБАЎ.**

**На суботу** сіноптыкі перадаюць **штармавое папярэджанне па моцным ветры**, парывы якога будуць дасягаць 15—20 м/с. На працягу сутак ад мінус 1 на поўдні, да мінус 12 градусаў на поўначы. У нядзелю рэзка пахаладае. Уначы будзе ўжо мінус 13—20, па паўночным усходзе да 24 градусаў ніжэй за нуль, удзень — 10—17 марозу. На паўднёвым захадзе традыцыйна цяплей: уначы мінус 7—12, удзень — 4—9 марозу.

**Увага! На наступным тыдні спецыялісты паведамляюць аб новым штармавым папярэджанні па моцным марозе.** У панядзелак уначы мінус 15—22, пры праясненнях да 24 марозу, удзень 10—17 градусаў ніжэй за нуль. На паўднёвым захадзе ўначы мінус 10—14, удзень — 6—9 марозу.

**З аўторка, у сераду і чацвер маразы** ўвогуле стануць сур'ёзнымі. Уначы прагназуецца мінус 17—24, пры праясненнях нават **да 32 марозу**. Сіноптыкі не выключаюць, што ў другой палове тыдня ўначы можа быць яшчэ халадней. Удзень мінус 11—18.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ ОАО «ПИЩЕВОЙ КОМБИНАТ «ВЕСЕЛОВО»

**15 марта 2011 г. в 14.00 состоится общее собрание акционеров ОАО «Пищевой комбинат «Веселово» по адресу: Минская область, Борисовский район, д. Веселово, ул. Заводская, 24 (актовый зал).**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности ОАО «Пищевой комбинат «Веселово» за 2010 год и основных направлениях деятельности развития ОАО «Пищевой комбинат «Веселово» на 2011 год.
2. Отчет о работе Наблюдательного совета за 2010 год.
3. Отчет Ревизионной комиссии о результатах проведенной ревизии и заключение по бухгалтерскому балансу.
4. Об утверждении годового отчета, бухгалтерского баланса и отчета о прибылях и убытках ОАО «Пищевой комбинат «Веселово» за 2010 год.
5. Об утверждении порядка распределения чистой прибыли Общества за 2010 год. О размере и сроке выплаты дивидендов за 2010 год.
6. О направлениях использования чистой прибыли на 2011 год и первый квартал 2012 года.
7. Утверждение новой редакции Устава Общества.
8. Об избрании членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии Общества.
9. О назначении вознаграждения членам Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
10. Об утверждении показателя по экономии ресурсов Общества на 2012 год.

Список участников собрания будет сформирован по состоянию реестра на 15 февраля 2011 г. Регистрация участников собрания будет проводиться с 13.00 до 13.45 по месту проведения собрания.

С материалами собрания можно ознакомиться по адресу: Минская область, Борисовский район, д. Веселово, ул. Заводская, 24 (приемная).

Для регистрации участникам собрания при себе необходимо иметь паспорт (для представителя акционера — паспорт и доверенность).

**Справки по телефону (80177) 779273**

УНП 690277551

Актуальна

# МІНЭКАНОМІКІ: КАЛІ ДАЛЕЙШЫ РОСТ ТАРЫФАЎ ЖКГ І БУДЗЕ, ТО НЕ БЕЗ ЗАБЕСПЯЧЭННЯ МЕР САЦЫЯЛЬНАЙ АБАРОНЕ

**З КАРОТКІМ КАМЕНТАРЫЕМ наконт павышэння цэн на жыллёва-камунальныя паслугі выступіў перад журналістамі Ігар ФАМІН, дырэктар Дэпартамента цэнавай палітыкі Міністэрства эканомікі:**

— Саветам Міністраў прынята пастанова (№ 138 ад 4 лютага 2010 года) аб змяненні з 1 лютага тарыфаў на жыллёва-камунальныя паслугі. Гэтае рашэнне прынятае ў сувязі з тым, што вельмі значна вырас кошт прыроднага газу, які імпартуецца з Расіі, павысіліся тарыфы на энергію, узрастаюць затраты газаэнергазабеспячальных арганізацый. Апошняе павышэнне тарыфаў ЖКГ адбылося 1 студзеня 2009 года, у 2010 годзе тарыфы не змяняліся. Да таго ж, росту тарыфаў папярэднічала апераджальнае павелічэнне пенсій і зарплат, — сказаў Ігар Фамін і падкрэсліў, што павелічэнне тарыфаў адбудзецца ў межах, акрэсленых Прэзідэнтам.

— Ці чакаць у бліжэйшы час далейшага росту тарыфаў на жыллёва-камунальныя паслугі? Усё будзе залежаць ад эканамічнай сітуацыі. Але калі гэты рост і будзе, то ён не адбудзецца без забеспячэння мер па сацыяльнай абароне, — сказаў Ігар Фамін.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

## ЗАКУПАЧНЫЯ ЦЭНЫ НА ЗБОЖЖА ЎРАДЖАЮ 2011 ГОДА ПАВЫШАНЫ Ў БЕЛАРУСІ НА 28 ПРАЦЭНТАЎ

**Закупачныя цэны на збожжавыя і крупяныя культуры ўраджаю 2011 года, якія будуць рэалізоўвацца для дзяржаўных патрэб, павышаны ў Беларусі ў сярэднім на 28 працэнтаў. Адпаведнае рашэнне зацверджана пастановай Савета Міністраў № 156 ад 8 лютага 2011 года, паведамілі БЕЛТА ў Апараце Саўміна.**

«Улічваючы кан'юнктуру цэн на знешнім рынку, нізкую рэнтабельнасць прадукцыі раслінаводства ў 2010 годзе, рост матэрыяльных затрат, звязаных з павелічэннем цэн на прамысловую прадукцыю, Мінсельгасхарч прапанаваў закупачныя цэны на збожжавыя і крупяныя культуры ўраджаю 2011 года ўстанавіць у памеры, які забяспечвае рэнтабельнасць 20 працэнтаў, г.зн. павялічыць іх у сярэднім на 28 працэнтаў», — адзначылі ў Міністэрстве сельскай гаспадаркі і харчавання, каменціруючы пастанову.

Закупачныя цэны на півавараны ячмень павышаны з Br390 тыс. да Br550 тыс. за тону, або на 41 працэнт. Прадугледжана таксама надбаўка ў памеры 1 працэнта да закупачнай цаны пры колькасці бялку 11-11,5 працэнта, у памеры 3 працэнтаў — пры колькасці бялку менш як 11 працэнтаў.

Цана на алейнае семя рапсу ўзрасла на 25 працэнтаў. Яна склала за тону алейнага семя рапсу для харчовых мэт Br1 млн, а за тону алейнага семя рапсу для тэхнічных мэт — Br938 тыс. За кошт павышэння цаны будзе забяспечана рэнтабельнасць рапсу ў памеры 25 працэнтаў пры ўраджайнасці 17 ц/га.

На цукровыя буракі цана павялічылася на 28 працэнтаў. Цана за тону базіснай нормы кандыцыйных буракоў склала Br140 тыс., некандыцыйных — Br112 тыс. Такі ўзровень цэн дасць магчымасць павысіць іх рэнтабельнасць да 32,7 працэнта пры ўраджайнасці 440 ц/га. На цукровыя буракі ў 2011 годзе не прадугледжана даплата з бюджэту.

Прырост выручкі сельскагаспадарчых арганізацый ад павышэння закупачных цэн на прадукцыю раслінаводства ўраджаю 2011 года ацэньваецца ў Br656 млрд, адзначылі ў Мінсельгасхарчы. У міністэрстве падкрэслілі, што зацверджанне закупачных цэн на сельскагаспадарчую прадукцыю ўраджаю 2011 года ў пачатку года дасць магчымасць сельскагаспадарчым арганізацыям больш эфектыўна спланаваць сваю вытворча-гаспадарчую дзейнасць на гэты год. Пастанова ўступае ў сілу пасля яе афіцыйнага апублікавання.

Погляд

# ПАВЫСІЛІ ТАРЫФЫ, ДЫ НЕ ТЫЯ?

## На думку эксперта ЖКГ Генадзя Калёнава, кошты на тэхнічнае абслугоўванне павінны былі павысіцца больш за ўсё

**Літаральна два дні таму ў краіне адбылося павышэнне тарыфаў ЖКГ. Апошні раз тарыфы павышаліся 1 студзеня 2009 года. Найбольш падрос кошт на газ, электраэнергію і халодную ваду. А вось кошт на тэхнічнае абслугоўванне павысіўся на 13 рублёў. І ў гэтай сферы пераходу на 100-працэнтную аплату, якой так даўно чакалі як ЖЭСы, так і таварыствы ўласнікаў і кіруючыя кампаніі, не адбылося. Што з гэтага вынікае для нас з вамі, «Звязда» высвятляла разам з выканаўчым дырэктарам Міжнароднай асацыяцыі менеджменту нерухомасці Генадзем КАЛЁНАВЫМ.**

***— Генадзь, скажыце, наколькі мэтазгодна было павялічваць тарыфы на камунальныя паслугі?***

— Тарыфы растуць ва ўсім свеце (інфляцыя плюс падвышэнне кошту на энерганосьбіты). Аднак разумееце, камунальныя паслугі — гэта вельмі шырокае паняцце. Сюды ж уваходзяць і водападагрэў, і электраэнергія, і г.д. У сферы ЖКГ ёсць манапалісты, у якіх сітуацыя не надта зменіцца і са 100-працэнтнай аплатай, і без яе. Ну, будзе ў таго ж «Мінгазу» рэнтабельнасць на 10—20 працэнтаў вышэй. Для яго гэта не крытычна... А вось для сферы абслугоўвання ЖКГ момант пераходу на рэнтабельнасць становіцца крытычным. Таму што, як толькі з'яўляецца рэнтабельнасць, адразу ідзе штуршок да канкурэнцыі, стварэнне якой у сферы ЖКГ прадугледжана Канцэпцыяй развіцця сістэмы ЖКГ да 2015 года...

***— А наколькі патрэбна павысіць кошт на тэхнічнае абслугоўванне?***

— У Мінску сабекошт тэхнічнага абслугоўвання больш за 1000 рублёў за $м^2$. І тое, што іх паднялі на 13 рублёў — гэта кропля. Я разумею, што Міністэрства эканомікі абмежавана пяццю доларамі павышэння ў год. Аднак калі б гэтыя пяць долараў перадаць цалкам у сферу абслугоўвання жыллёва-камунальнай гаспадаркі, то, на мой погляд, гэта было б нашмат эфектыўней, чым раздзяляць пакрыху на ўсе сферы.

***— Ці можна адназначна казаць, што пры падвышэнні тарыфаў будзе павялічвацца і якасць аказваемых паслуг?***

— Не. Гэта зусім розныя катэгорыі. На падвышэнне якасці ўплывае канкурэнцыя, а не тарыф. Акрамя таго, у Беларусі цалкам адсутнічаюць грамадскія жыллёвыя арганізацыі (фізасоб — спажыўцоў камунальных паслуг) і ў процівагу ім саюзы ЖБК, кіруючых кампаній, якія разам павінны адыгрываць вельмі важную ролю ў кантролі за коштам і якасцю, а таксама і рэгуляваць праблемы, што ўзнікаюць.

***— Магчымы варыянт, што пры з'яўленні канкурэнцыі і кіруючых кампаній спажыванне энергарэсурсаў зменшыцца і людзі стануць плаціць менш, чым пры такіх жа тарыфах, але са старой сістэмай?***

— Так, калі будзе канкурэнцыя за права кіраваць шматпавярховымі жылымі комплексамі па прынцыпе «чым больш дамоў, тым большы прыбытак». У выпадку цвёрдай канкурэнцыі выйграе той, у каго пры высокай якасці ніжэйшыя тарыфы. Напрыклад, рэнтабельнасць жыллёвых кампаній у Берліне 3,3—3, 7%. У каго 5%, ужо прайграе. Сітуацыя ў РФ, дзе прайшлі рэформы, зусім іншая: там няма рэальнай канкурэнцыі, і галіна моцна крыміналізаваная.

***— Наколькі рэальна дасягнуць планкі 60 адсоткаў аплаты камунальных паслуг да канца 2015 года?***

— Нават калі мы выйдзем на 60% аплаты камунальных паслуг, то гэта не вырашыць галоўную праблему — праблему манаполіі ЖЭСаў. Зараз жа кампаніі заціснуты ў такія ўмовы, што іх дзейнасць абсалютна нерэнтабельная. Чаму не робяцца захады да стварэння канкурэнцыі, я не ведаю...

***— Як вы думаеце, чаму заяўленыя ў Канцэпцыі развіцця сістэмы ЖКГ параметры дагэтуль не выкананы?***

— А што, насельніцтва знаёма з гэтай Канцэпцыяй? Дакумент ціха нарадзіўся і ціха памёр.

***— Што нас чакае ў выніку нулявых змен?***

— Калі так сітуацыя пойдзе і далей, а значыць, калі будзе расці кошт у такім кірунку, то нас чакае сур'ёзны недарамонт. Таму што жыллёвы фонд старэе. І праз 5-10 год хрушчоўкі ў масавым парадку запатрабуюць капітальнага рамонту. Прычым з укладаннем вялікіх грошай. Жыллёва-камунальныя прадпрыемствы проста не будуць спраўляцца. І дзяржава будзе вымушана браць усе выдаткі на сябе. А гэта значыць што? Тое, што падаткі будуць расці. А іншае выйсце — вельмі сур'ёзнае павышэнне тарыфаў у адзін момант. Што, вядома, выкліча вялікую сацыяльную напружанасць. Яшчэ адзін момант — уцечка кадраў са сферы абслугоўвання жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

***— Колькі яшчэ зможа пратрымацца старая сістэма ЖКГ?***

— Васьміног Паўль ужо не з намі *(усміхаецца)*. А калі сур'ёзна, то рашэнне пра пачатак рэальных рэформаў толькі на высокім узроўні. Жыхары сваё меркаванне выказалі — кіраваннем жылфондам незадаволена большасць (згодна з маніторынгам Адміністрацыі Прэзідэнта, праведзеным у мінулым годзе).

***— За які час можа прайсці жыллёвая рэформа ў Беларусі?***

— У залежнасці ад таго, што разумець пад рэформай. Стварэнне канкурэнтнага асяроддзя — некалькі гадоў. Набыццё вопыту і падрыхтоўка высокакваліфікаваных кіраўнікоў — каля 10 гадоў.

***— Чый вопыт на гэтым этапе нам больш за ўсё падыходзіць?***

— Еўрапейскі, а больш за ўсё — нямецкі, калі падняць планку вышэй. Іх сістэма спалучае ў сабе самакіраванне на ўзроўні сумеснага домаўладання з высокім прафесіяналізмам прыватных кіруючых кампаній. А таксама наяўнасць велізарнай колькасці грамадскіх арганізацый, саюзаў і асацыяцый, што ўладжваюць канфлікты паміж насельніцтвам, кіраўнікамі і ўласнікамі кватэр (дамоў). У Германіі вельмі высокая сацыяльная падтрымка, а таксама моцна развітыя «гарызантальныя» сувязі ў адносінах паміж уласнікамі, арандатарамі жылля і кіруючымі кампаніямі, органамі мясцовай улады.

**Настасся ЗАНЬКО.**

### Даведка «Звязды»

***Генадзь Калёнаў** — выканаўчы дырэктар Міжнароднай асацыяцыі менеджменту нерухомасці (МАМН), сем год працаваў галоўным інжынерам таварыства ўласнікаў «Ачаг». Удзельнік праектаў дапамогі Беларусі Федэральнага ўрада Германіі «Распрацоўка праграмы павышэння кваліфікацыі для кіраўнікоў ТУ і ЖБК» (2008), праекта ЕС «Жыллёвыя рэформы з удзелам насельніцтва, дыялог з мясцовымі органамі ўлады» (2009—2010) і «Стварэнне міжнароднай асацыяцыі менеджменту нерухомасці» (2010—2011).*

ISSN 1990 - 763X

| Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 12.02.2011 г. (для б/н разлікаў) | | | |
|---|---|---|---|
| ▲ 1 долар ЗША | 3 014,00 | 1 чэшская крона | 168,29 |
| ▼ 1 еўра | 4 083,97 | 1 польскі злоты | 1 037,72 |
| 1 латвійскі лат | 5 792,81 | ▲ 1 расійскі рубель | 102,80 |
| 1 літоўскі літ | 1 181,57 | 1 украінская грыўня | 378,91 |

| Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ | |
|---|---|
| USD | 29,3200 |
| 10 UAH | 36,8689 |
| 1000 BYR | 9,7376 |
| EUR | 39,7667 |

# Народнай арміі салдаты

**Эксклюзіўнае інтэрв'ю Міністра абароны Рэспублікі Беларусь Юрыя ЖАДОБІНА газеце «Звязда»**



**СЁННЯ ў краіне свята — нававбранцы прымаюць прысягу.**

**Напярэдадні гэтай падзеі мы сустрэліся з Міністрам абароны Беларусі, генерал-лейтэнантам Юрыем Віктаравічам Жадобіным.**

**Гутарка была разнапланавай, закраналіся, здаецца, усе самыя актуальныя, надзённыя пытанні, бо тэма гэтая — без перабольшання! — «свая» для кожнай сям'і, для ўсяго грамадства: яна цікавіць не толькі прызыўнікоў, іх бацькоў, сваякоў і блізкіх; сённяшніх ваеннаслужачых і тых, хто ўжо адслужыў, выканаў грамадзянскі абавязак; юнакоў, якія толькі рыхтуюцца стаць у строй, і іх прадзедаўветэранаў; хвалюе гэтая тэма, безумоўна, і дзяўчат, якія чакаюць і будуць чакаць сваіх салдатаў...**

**Беларуская армія — НАРОДНАЯ па сутнасці сваёй. Невыпадкова і гутарка з Міністрам Жадобіным была максімальна адкрытай.**

*Крыху пра госця «Звязды». Юрый Жадобін у 1976 годзе скончыў Казанскае вышэйшае танкавае каманднае вучылішча, у 1985-м — камандны факультэт Ваеннай акадэміі бранятанкавых войскаў імя Р. Маліноўскага. З 1976 па 1990 год прайшоў усе службовыя ступені ад камандзіра ўзвода да камандзіра палка. У 1990—1999 гадах служыў на камандных пасадах у сістэме грамадзянскай абароны Беларусі, унутраных войсках МУС. З 1999 года займаў пасаду намесніка міністра ўнутраных спраў — камандуючага ўнутранымі войскамі. З верасня 2003 года — начальнік Службы бяспекі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. У ліпені 2007-га назначаны старшынёй Камітэта дзяржаўнай бяспекі Беларусі. З 2008 года займаў пасаду дзяржаўнага сакратара Савета Бяспекі Беларусі. Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь 4 снежня 2009 года назначаны Міністрам абароны Рэспублікі Беларусь. Узнагароджаны ордэнамі «За службу Радзіме» трэцяй ступені і «Чырвонай Зоркі», медалямі «За бездакорную службу» першай ступені, іншымі.*

*І яшчэ адна, на наш погляд, надзвычай красамоўная дэталь. Казанскае вучылішча Юрый Жадобін скончыў з адзнакай, яму было прадастаўлена права самому вызначыць месца службы. Не задумваючыся, выбраў Беларусь — бо з дзяцінства марыў пабываць на легендарным Буйніцкім полі, прайсці шляхам любімага паэта Канстанціна Сіманава, вершы якога можа дэкламаваць на памяць гадзінамі...*

### ПАТРЫЯТЫЗМ — ПАДМУРАК КАНЦЭПЦЫІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БЯСПЕКІ

**— Прэстыж беларускай арміі расце. Людзі ў ваеннай форме — і афіцэр, і радавы салдат — успрымаюцца ў грамадстве з безумоўнай павагай. Што можна вызначыць як патрыятычнае крэда, ідэалагічны слоган беларускай арміі?**

— Узброеныя Сілы з'яўляюцца аўтарытэтным сацыяльным інстытутам у краіне. Па рэйтынгу даверу яны на працягу апошняга дзесяцігоддзя займаюць другое месца пасля Кіраўніка дзяржавы і першае месца сярод усіх дзяржаўных органаў сістэмы бяспекі.

Што датычыцца патрыятычнага крэда беларускага войска, то наша ўласная гісторыя неаднойчы пацвярджала, што перамогі ў бітвах дасягаюцца войскамі, але войны выйграюцца толькі народамі. Вялікая Айчынная вайна — яркае сведчанне гэтага. Немагчыма перамагчы народ! У сувязі з гэтым цалкам заканамерна Канцэпцыяй нацыянальнай бяспекі вызначана, што ў вырашэнні найважнейшай задачы ў інтарэсах забеспячэння ваеннай бяспекі — падрыхтоўкі краіны да абароны — першарадная ўвага надаецца развіццю ў грамадстве патрыятызму, выхаванню ў грамадзян пачуцця адказнасці за абарону Айчыны.

Гаворка ідзе пра тое, што армія — гэта арганічная і непадзельная частка беларускага народа і ў гэтым, калі хочаце, ідэалагічны слоган беларускай арміі: «Армія — гэта народ».

Дарэчы, у апошняе дзесяцігоддзе менавіта з такой пазіцыі падыходзілі мы да будаўніцтва Узброеных Сіл, крытыкуючы яўна неадэкватны тэзіс, модны ў свой час у СССР: «Народ і армія — адзіныя». Гэтым, па сутнасці, штучна супрацьпастаўляліся народ і армія, таму што быццам бы неабходна было яшчэ камусьці даказваць само арганічнае іх адзінства.

### ЁСЦЬ ТАКАЯ ПРАФЕСІЯ — АБАРАНЯЦЬ РАДЗІМУ!

**— Юрый Віктаравіч, Вы неаднаразова падкрэслівалі, што ў Беларусі створана нацыянальная ваенная школа — якія яе асноўныя спецыфічныя характарыстыкі?**

— Прадмет нашай гордасці — стварэнне нацыянальнай сістэмы ваеннай адукацыі. Пра неабходнасць мець уласную ваенную школу, Ваенную акадэмію, было сказана нямала слоў у пачатку 1990-х. Але толькі ў 1994 годзе спецыяльна створаная рабочая група прапанавала аптымальную мадэль арганізацыі акадэміі, якая і была рэалізаваная. 17 мая 1995 года выдадзены Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб стварэнні Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь», а 1 верасня 1995 года ў ёй пачаліся заняткі.

Сёння ў рэспубліцы падрыхтоўка ваенных кадраў ажыццяўляецца ва ўстанове адукацыі «Ваенная акадэмія Рэспублікі Беларусь», на сямі ваенных факультэтах і чатырох ваенных кафедрах грамадскіх устаноў адукацыі, дзе вучацца афіцэры аператыўна-тактычнага звяна — па 18 спецыяльнасцях і спецыялізацыях, афіцэры тактычнага звяна — па 90 спецыяльнасцях, спецыялізацыях і накірунках, а афіцэры запасу — па 48 спецыяльнасцях.

Пры Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь адкрыты вышэйшыя акадэмічныя курсы, у 2006 годзе створаны факультэт Генеральнага штаба Узброеных Сіл. Менавіта з адкрыццём у 2006 годзе факультэта Генеральнага штаба было завершана стварэнне нацыянальнай сістэмы ваеннай адукацыі.

Трэці выпуск факультэта Генеральнага штаба, праведзены летась, сведчыць пра тое, што наша сістэма ваеннай адукацыі актыўна развіваецца і забяспечвае самадастатковасць краіны ў вырашэнні найважнейшай дзяржаўнай задачы — падрыхтоўкі кадраў для ўсіх звёнаў кіравання сістэмай забеспячэння нацыянальнай бяспекі.

А той факт, што сярод выпускнікоў факультэта ў 2010 годзе ўпершыню былі афіцэры Узброеных Сіл Казахстана, сведчыць пра эфектыўнасць не толькі супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі, але і пра запатрабаванасць беларускай сістэмы ваеннай адукацыі за межамі нашай краіны.

Падрыхтоўка афіцэрскіх кадраў ажыццяўляецца не толькі ў Ваеннай акадэміі, але і на ваенных факультэтах вядучых вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь.

Улічваючы, што колькасць афіцэраў запасу значна перавышала патрэбнасці Узброеных Сіл, а па шэрагу спецыяльнасцяў малодшых ваенных спецыялістаў адчуваўся пэўны дэфіцыт, сёння на ваенных факультэтах і кафедрах праводзіцца навучанне студэнтаў па праграме малодшых спецыялістаў.

У залежнасці ад вынікаў навучання і патрэбнасці Міністэрства абароны ў афіцэрах запасу, частка студэнтаў у далейшым працягвае навучанне па праграмах падрыхтоўкі афіцэраў запасу, пасля заканчэння якога ім прысвойваецца афіцэрскае званне.

Створана і нацыянальная сістэма падрыхтоўкі лётчыкаў. Гэта дазволіла адмовіцца ад падрыхтоўкі курсантаў за мяжой, знізіць расходы на пачатковую падрыхтоўку лётчыкаў у 2,5—3 разы, скараціць тэрміны асваення баявых самалётаў.

Асаблівасцю нацыянальнай сістэмы ваеннай адукацыі з'яўляецца таксама арганічная сувязь тэарэтычнай падрыхтоўкі і вайсковай практыкі. Так, усе вайсковыя стажыроўкі курсантаў і слухачоў ваенных навучальных устаноў сумяшчаюцца па часе правядзення з асноўнымі мерапрыемствамі Узброеных Сіл, у тым ліку вучэннямі. Напрыклад, летась 100 працэнтаў курсантаў, якія вучацца на факультэце ППА па спецыялізацыі зенітна-ракетнага комплексу «Бук», атрымалі практыку падрыхтоўкі і правядзення баявых стрэльбаў на расійскім палігоне «Ашулук». Пасля выпуску з ваеннай ВНУ яны змогуць самастойна паспяхова выконваць задачы па прызначэнні.

Такім чынам, у рэспубліцы створана эфектыўная сучасная самадастатковая сістэма ваеннай адукацыі.

СТАР. 2



# Дырэктар ААТ «Белювелірграндаль»:

# «У нас няма пагоні за прыбыткам любой цаной — МЫ ПРАЦУЕМ ПЕРШ ЗА ЎСЁ ДЛЯ НАШЫХ ПАКУПНІКОЎ!»

**Ніводная жанчына сёння не можа абысціся без ювелірных вырабаў: хіба можна пайсці на працу без прыгожых завушніц ці пярсцёнка? А тым больш — у рэстаран, на банкет, у тэатр, на вяселле... Ювелірныя вырабы вельмі шчыльна ўпляліся ў нашае жыццё, а традыцыі іх вырабу і прымянення зарадзіліся вельмі і вельмі даўно. Дарэчы, для нашых далёкіх продкаў ювелірныя вырабы мелі не толькі эстэтычную функцыю — яны верылі, што каштоўныя ўпрыгожанні маюць пэўны магічны сэнс, абараняюць нас ад злых чараў, непрыемнасцяў і нават ад фізічных нападзенняў.**

**Зараз, вядома, далёка не каменны век, аднак традыцыі ўпрыгожваць сябе і сваё жыццё ў нас захаваліся. У гэтым плане, можна сказаць, пашанцавала беларусам — быць прыгожымі і зіхацець нават у пахмурныя дні можна з дапамогай ААТ «Белювелірграндаль», чатыры дзясяткі фірменных ювелірных крам якога ёсць у 25 гарадах Беларусі.**

— Сёння нашае прадпрыемства памяняла статус і з унітарнага прадпрыемства мы сталі адкрытым акцыянерным таварыствам са 100% дзяржаўным капіталам, — пачалі мы гутарку з **Уладзімірам МІРГАЛОЎСКІМ, дырэктарам ААТ «Белювелірграндаль»**. — Вядома, гэта ўнясе пэўную навізну ў працу, але асноўныя задачы нашы абсалютна не змяніліся: мы па-ранейшаму будзем забяспечваць нашых пакупнікоў высакакласнымі ювелірнымі вырабамі, прычым любога цэнавага фактару — ад шматмільённых эксклюзіўных вырабаў да недарагіх серыйных.



**Дырэктар Уладзімір МІРГАЛОЎСКІ.**

«Белювелірграндаль» на сёння з'яўляецца салідным гульцом на беларускім рынку ювелірных вырабаў: прадпрыемства штомесяц плаціць каля мільярда рублёў падаткаў у бюджэт краіны і займае каля 30% на ювелірным рынку Беларусі:

— Нашая ўдзельная вага на рынку рэспублікі — не маленькая, аднак мы не імкнёмся да чагосьці заоблачнага: няхай будзе пастаянна 30%. Галоўнае — каб людзі бачылі нашу нармальную, устойлівую і стабільную працу. Варта толькі адзін раз завітаць у нашы крамы, і пакупнік адразу пабачыць высокі ўзровень культуры, абслугоўвання, тэхнічнай аснашчанасці. За пяць апошніх гадоў мы павялічылі тавараабарот з 20 да 60 мільярдаў рублёў. Толькі за снежань 2010 года тавараабарот склаў 9 мільярдаў рублёў, з якіх 1 мільярд нагандляваў наш магазін-лідар.

## Золата і срэбра

Аднак, напэўна, важным фактарам для пакупніка будзе не толькі наяўнасць ювелірнай крамы ў яго горадзе, але і яе асартымент. І тут магазіны «Белювелірграндлю» могуць даць фору любой камерцыйнай краме — ва ўсіх сарака крамах гэтага прадпрыемства на вітрынах знаходзіцца каля 110 тысяч найменняў ювелірных вырабаў, прычым залатыя і сярэбраныя маюць прыкладна аднолькавую долю.

— Мы працуем з вытворцамі ювелірных вырабаў з Беларусі, Расіі, Украіны, Чэхіі, Турцыі, Славакіі, Італіі, таму ў нас найшырэйшы асартымент прадукцыі. Безумоўна, як любое беларускае прадпрыемства, мы робім стаўку і на нашых айчынных вытворцаў: актыўна гандлюем прадукцыяй гомельскіх «Крышталя» і ЗАТ «Белгран», бабруйскага завода «Эгрэт», а таксама гадзіннікамі Мінскага завода «Прамень», сувенірнай прадукцыяй Аршанскага льнокамбіната, дзяржаўнага вытворча-гандлёвага аб'яднання «Белмастацтвапромыслы», шклозавода «Неман», Барысаўскага крышталёвага завода і гэтак далей.

Пры гэтым, калі браць увесь аб'ём прадстаўленай у крамах «Белювелірграндлю» прадукцыі, то каля 30% займае якраз прадукцыя ювелірных прадпрыемстваў Гомеля, а каля 60% — завозіцца з-за мяжы (астатнія 10% застаюцца за сувенірнай прадукцыяй). Ювелірныя ўпрыгожванні беларускай вытворчасці маюць добрую якасць і карыстаюцца стабільным попытам сярод пакупнікоў.

**«Белювелірграндаль» — салідны гулец на беларускім рынку: прадпрыемства штомесяц плаціць каля 1 млрд рублёў падаткаў і займае каля 30% на ювелірным рынку Беларусі».**

— Калі казаць пра залатыя вырабы, і ў прыватнасці ланцужкі, то мы іх, у асноўным, атрымліваем з маскоўскага завода «Адамас», «Алмаз-холдынга» і іншых пастаўшчыкоў. Залатых ланцужкоў мы маем асартымент вельмі шырокі, іх шмат прадаецца, і таму на гэты год мы паставілі задачу яшчэ больш пашырыць асартымент і зрабіць яго амаль невычарпальным. Што тычыцца залатых завушніц і пярсцёнкаў з каштоўнымі і паўкаштоўнымі вырабамі, то мы іх атрымліваем і з маскоўскіх заводаў, і з піцерскіх, і з кастрамскіх, а таксама з іншых рэгіёнаў Расіі. Сярэбраных вырабаў у Беларусі выпускаецца вельмі мала, таму іх мы закупляем у Расіі, Італіі, ва Украіне і ў іншых краінах свету.

Прычым у гандлёвым сеціве «Белювелірграндлю» можна знайсці не толькі серыйныя вырабы, але і сапраўдны эксклюзіў — напрыклад, набор сярэбранага посуду з гербам Рэспублікі Беларусь, які можа стаць вельмі добрым і знакавым падарункам для вашых партнёраў. Ці, скажам, эксклюзіўныя калекцыі ювелірных вырабаў з золата сусветна вядомага італьянскага брэнда «Рабэрта Брава» або арыгінальныя чэшскія каштоўныя сярэбраныя вырабы з граната, якія закупляюцца напрамую «Белювелірграндлем» ад вытворцы ў Празе.

— У залежнасці ад густу і таўшчыні кашалька мы гатовыя задаволіць любое пажаданне нашага пакупніка, — кажа дырэктар «Белювелірграндлю» Уладзімір Міргалоўскі. — Тым больш, што мы сёння працуем і на заказ па каталогах.





## Хочаш трохі зэканоміць? Сачы за акцыямі!

«Белювелірграндаль» сваім кліентам акрамя якаснай прадукцыі вельмі часта прапануе і спецыяльныя ўмовы для набыцця ювелірных вырабаў — у пэўны час для некаторых катэгорый пакупнікоў дзейнічаюць зніжкі да 25%. Фактычна можна сказаць, што «Белювелірграндаль» не абмінае ўвагай ніводнае дзяржаўнае свята: ёсць зніжкі да 23 лютага, да 8 сакавіка, да 9 мая, да 3 ліпеня, да 1 верасня, да Дня матулі, да 14 лютага, да Дня студэнта, да Новага года і Каляд і гэтак далей. Такім чынам, напрыклад, ветэраны Вялікай Айчыннай вайны і воіны-інтэрнацыяналісты могуць напярэдадні Дня Перамогі і Дня Незалежнасці набыць ювелірныя вырабы са зніжкай, напярэдадні Дня матулі больш танна ўпрыгожванні могуць набыць шматдзетныя матулі, напярэдадні Дня ведаў — настаўнікі... А вось і адна з апошніх акцый «Белювелірграндлю»: 25 студзеня, у Таццянін дзень, зніжкі атрымлівалі ўсе студэнты і Таццяны, а галоўны сюрпрыз быў для тых Таццян, якія нарадзіліся 25.01 — памер зніжкі для іх складаў 25%.

«Гэта не салідна, — скажаце вы, — маўляў, у іншых крамах зніжкі і да 50% даходзяць!» Аднак вы не зусім маеце рацыю: галоўнае не сам працэнт, а тая база, ад якой ён бярэцца — можна спачатку нацэначку зрабіць у 200%, а потым ужо і скінуць з барскага пляча 50%. Што тычыцца «Белювелірграндлю», то тут палітыка цэнаўтварэння і зніжак будуецца на сумленнасці, каб у выгодзе застаўся і пакупнік, і прадавец:

— Мы працуем стабільна і трымаем амаль на ўсе вырабы невялікую нацэнку, але далёка не 100% і не 200%. Таму нашыя зніжкі, якія мы прадстаўляем для пакупнікоў, абсалютна рэальныя і апраўданыя: калі мы даём зніжку 25%, то фактычна ад нацэнкі мы сабе пакідаем 5-10%. Мы ў большасці працуем непасрэдна з заводамі, таму ніякіх дадатковых выдаткаў не нясем, ніякіх дадатковых накрутак пасярэднікі нам не робяць, таму ў нас сапраўды высокаканкурэнтны тавар па цэнавым фактары. Скажу больш, нават калі здарыўся сусветны крызіс, мы не павысілі цэны ні на адзін наш выраб. Так, мы згубілі за гэты час 600 мільёнаў рублёў, але затое мы паказалі нашаму пакупніку, што мы не імкнёмся набіць свае кішэні, а перш за ўсё клапоцімся аб нашых кліентах.



**Прадавец сталічнага магазіна «Чараўніца» Аляксандра ЖАМАЙТУК асвоіла не толькі англійскую, але і з кітайскім пакупніком можа размаўляць на яго роднай мове.**



**«У сарака філіялах на вітрынах знаходзіцца каля 110 тысяч найменняў ювелірных вырабаў».**



Літаральна некалькі дзён таму скончылася сумесная акцыя «Белювелірграндлю» і Гомельскага ВА «Крышталь» пад назвай «Калядныя сюрпрызы»: сярод пакупнікоў гомельскіх ювелірных вырабаў былі разыграны 120 залатых вырабаў, 400 сярэбраных і шэсць суперпрызоў, сярод якіх лашчыў позіркі залаты пярсцёнак з брыльянтам у 1 карат коштам 11,2 мільёна рублёў.

Варта таксама адзначыць, што ў крамах ААТ «Белювелірграндаль» дзейнічае і дысконтная праграма: у пэўныя святочныя дні (напрыклад, пры адкрыцці адрэканструяванага магазіна) пакупнікі маюць магчымасць атрымаць залатую ці сярэбраную дысконтныя карткі, якія даюць права ў далейшым набываць ювелірныя ўпрыгожванні з 10% і 5% зніжкай адпаведна.

Наступная бліжэйшая акцыя прымеркаваная да Дня ўсіх закаханых 14 лютага: у гэты дзень можна завітаць у любую з 40 фірменных крам «Белювелірграндлю» і набыць свайму каханаму чалавеку які-небудзь прыгожы ювелірны выраб са зніжкай да 10%. А вось тым, каго бацькі назвалі Валянцінам ці Валянцінай, у гэты дзень пашанцавала больш: варта прыйсці з пашпартам у ювелірную краму і атрымаць зніжку ў 14% на любы тавар.

**«Акцыя да Дня ўсіх закаханых 14 лютага: кожнаму наведвальніку — зніжка да 10%. А Валянціну ці Валянціне — 14% на любы тавар»**

## Залатыя правілы, залатыя гарантыі

Прамая праца з вытворцамі дазваляе «Белювелірграндлю» гарантаваць сваім кліентам, што на вітрынах ювелірных крам знаходзяцца выключна якасныя ўпрыгожванні ці сталовае срэбра. Да таго ж, увесь асартымент тавару правяраецца дадаткова і спецыялістамі па якасці самога «Белювелірграндлю»:

— У нас у штаце ёсць таваразнаўцы па якасці, — расказвае **Алена ПАЎЛАВА, начальнік аддзела арганізацыі гандлю.** — Калі на нашы склады прыходзіць тавар, то абавязкова кожная яго партыя выбарачна правяраецца спецыялістамі па якасці. І калі ёсць якія-небудзь дэфекты ў камянях ці ў самім вырабе, то мы звязваемся з пастаўшчыкамі і замяняем.

— Наш лозунг — «Залатыя правілы, залатыя гарантыі», — дадае Алена Паўлава. — Тое, што прапануе і прадае «Белювелірграндаль», — гэта толькі сапраўды высакаякасныя вырабы, набыўшы якія пакупнік застанецца задаволены. Бо ювелірныя ўпрыгожванні — гэта не нейкая сезонная рэч, гэта тавар працяглага карыстання, а некаторыя ювелірныя вырабы служаць не толькі аднаму чалавеку, але і перадаюцца ў спадчыну.



**«Залатыя правілы, залатыя гарантыі: калі спецыялісты знаходзяць дэфекты ў камянях ці ў самім вырабе, то пастаўшчык іх без праблем замяняе».**

## Беларусы сталі купляць больш дарагія ювелірныя вырабы

Сёння падыход нашых грамадзян да выбару і набыцця ювелірных вырабаў і вырабаў з каштоўных металаў змяніўся: упрыгожанне павінна быць не толькі якасна зроблена, але яшчэ і адпавядаць модным тэндэнцыям. І «Белювелірграндаль», як расказала «Звяздзе» **вядучы тавараўед гэтага прадпрыемства Таццяна ПАТАПЧЫК,** безумоўна, стараецца сваім пакупнікам дагадзіць: супрацоўнікі прадпрыемства пастаянна выязджаюць на міжнародныя ювелірныя выставы ў Маскву, Санкт-Пецярбург, а таксама ў Стамбул і Прагу, дзе сусветна вядомыя фірмы дэманструюць свае навінкі.



— Сёння пакупнік мяняецца, у яго ўжо не тыя перавагі, якія былі яшчэ пару гадоў таму. Раней прадавалася ўсё, што ляжала на прылаўках, а сёння пакупнік сам выбірае, што купіць, і выбар робіць перш за ўсё на карысць высакакласных вырабаў, калекцый, знакамітых брэндаў. Чым абумоўлены такія змены ў попыце? А тым, што калі ў насельніцтва павышаецца дастатак, то людзі ўжо, калі вобразна сказаць, хочуць есці не з алюмініевай лыжкі, а з сярэбранай. Дарэчы, мы канстатуем рост продажаў сталовага срэбра: купляюць як і цэлыя наборы, так і асобныя прадметы. Напрыклад, самым папулярным таварам сёння з'яўляюцца сярэбраныя чайныя лыжачкі са знакамі Задыяка — бо кожная бабуля ці матуля хоча набыць для свайго дзіцяці такі падарунак, дзе можна і на памяць адпаведную гравіровачку зрабіць. Мы паважаем нашага пакупніка, яго густ, улічваем усё тэндэнцыі і таму прадукцыю выстаўляем на вітрыны згодна з патрабаваннямі густу і ўзроўнем даходаў нашых кліентаў.



— Сапраўды, калі раней купляліся недарагія вырабы з золата ад 150 тысяч рублёў, то зараз пакупнікі пачалі больш звяртаць сваю ўвагу на дарагія ювелірныя ўпрыгожванні з каштоўнымі камянямі — брыльянтамі, сапфірамі, смарагдамі, — працягвае тэму Алена Паўлава. — Напэўна, людзі сталі разумець, што лепш набываць дарагія рэчы, бо іх потым можна перадаць у спадчыну як сямейную каштоўнасць.

Таксама Алена Леанідаўна адзначыла, што пэўныя змены пакупніцкага попыту назіраюцца і ў залежнасці ад сезонаў: вясной жанчыны пачынаюць здымаць галаўныя ўборы і ў ювелірных крамах больш прадаюцца завушніцы, а з надыходам лета, калі адкрываецца дэкальтэ, то павышаюцца продажы ланцужкоў і караляў.

## Шукаеце пярсцёнкі на вяселле? Тады вам у «Залаты пярсцёнак»!

За апошні час «Белювелірграндаль» актыўна праводзіць рэканструкцыю сваіх магазінаў: робіцца не толькі рамонт, але і праводзіцца рэканструкцыя гандлёвых залаў, замяняецца на самае сучаснае абсталяванне. У прыватнасці, трыццаць з сарака магазінаў ужо сустракаюць пакупнікоў у абноўленым выглядзе. Зусім нядаўна якраз была адкрыта пасля рэканструкцыі трыццатая па ліку крама — «Яшма» ў горадзе Маладзечна. У планах прадпрыемства — актыўна папрацаваць над рэканструкцыяй і астатніх 10 магазінаў: 7-8 з іх павінны быць адрамантаваны ўжо сёлета, а астатнія 2-3 — у 2012 годзе.

— За кошт чаго мы павялічылі тавараабарот у тры разы? Якраз з-за рэканструкцыі нашых філіялаў, іх комплекснай перабудовы, рамонтаў і рэканструкцыі: мы ўсталявалі там самае сучаснае гандлёва-тэхналагічнае абсталяванне, якое адпавядае сусветным узорам. І сёння такія магазіны, як, напрыклад, «Аметыст» ці «Залаты пярсцёнак», з'яўляюцца гандлёвымі аб'ектамі найвышэйшага ўзроўню. Пакупнікі нашы нават здзіўляюцца і не вераць, што гэта цалкам дзяржаўны магазін, — сказаў дырэктар ААТ «Белювелірграндаль». Вось яшчэ адзін цікавы факт — да нас у мінулым годзе прыязджалі бізнэсмены са Швейцарыі, якія займаюцца ювелірнай справай, наведалі нашу краму «Залаты пярсцёнак» і сказалі: «Мы не чакалі пабачыць такі высокі ўзровень».

Дарэчы, сталічная крама «Залаты пярсцёнак» была адрамантавана два гады таму, але і сёння там захоўваецца такі шыкоўны інтэр'ер, як быццам будаўнікі і маляры толькі ўчора здалі аб'ект «пад ключ».

— Падтрымліваем прыгажосць і чысціню пасля рамонту, бо і нам самім прыемна працаваць у такім шыкоўным магазіне. Таксама вельмі прыемна, калі да нас прыходзяць пакупнікі і кажуць, што наш магазін — самы прыгожы і лепшай крамы ў Мінску яны не бачылі, — расказвае **Вольга АНДРОНЧЫК, намеснік загадчыка магазіна «Залаты пярсцёнак»**. — Безумоўна, нам прыемна гэта чуць. Адпаведна, і настрой падымаец-





**«У ювелірнай справе не бывае дробязяў — усё, пачынаючы ад знешняга выгляду крамы і да асартыменту прадукцыі, павінна быць на вышэйшым узроўні».**



Розыгрыш суперпрызоў сумеснай акцыі «Белювелірграндлю» і Гомельскага ВА «Крышталь». Галоўны прыз — залаты пярсцёнак з брыльянтам у адзін карат.


Ну як не купіць прыгожыя бурштынавыя каралі ў Ганны ШУЛЬП, прадаўца магазіна «Яшма».

## Уладзімір МІРГАЛОЎСКІ:

# «Мы адрамантавалі «Яшму» ў Маладзечне такім чынам, каб гэты магазін быў падобны на нейкае дзіўнае царства»

Магазін-філіял «Яшма» ў Маладзечне пасля капітальнага рамонту і рэканструкцыі быў адкрыты 27 студзеня. Пяць месяцаў там вяліся будаўнічыя работы, а зараз гэтая ювелірная крама зноў гасцінна расчыніла свае дзверы перад пакупнікамі. «Яшма» пасля рэканструкцыі стала магазінам еўрапейскага ўзроўню:

— Мы адрамантавалі «Яшму» ў Маладзечне такім чынам, каб гэты магазін быў падобны на нейкае дзіўнае царства, каб заходзіць туды была адна асалода. Я лічу, што гэтая крама еўрапейскай якасці і ўсё там зроблена на найвышэйшым узроўні.

Такога ж меркавання пра абноўленую краму прытрымліваецца і яе **загадчык Ала ЦІХАН:**

— Мы ў захапленні ад зробленага! Хоць мы пасля адкрыцця працуем толькі пару тыдняў, але можна сказаць, што продажы пасля рамонту значна павялічыліся: людзі ідуць і ў выхадныя, і ў будні. Скажу больш: у нас у дзень адкрыцця выдаваліся дысконтныя карты, дык вось ужо два чалавекі, якія іх атрымалі, прыходзілі да нас паўторна — прызнаецца Ала Гаўрыілаўна. — Я сама знаходзілася тут падчас рамонту, каардынавала працу, таму на ўласныя вочы бачыла, як тут усё было якасна зроблена, у адпаведнасці з тэхналогіяй. Дарэчы, мы зрабілі нават не рамонт, а рэканструкцыю — гэта ўжо іншы маштаб: тут замянілі ўсе інжынерныя камунікацыі, зрабілі вітрыны ў вокнах, памянялі гандлёвае абсталяванне, каб магазін зайграў новымі фарбамі. Што тычыцца асартыменту, то ён стаў шырэйшы, бо мы павялічылі выставачную плошчу і можам прапанаваць больш тавару. Да таго ж, зараз маем магчымасць прапаноўваць ювелірныя вырабы не паасобку, а фарміраваць калекцыі — наша гандлёвае абсталяванне дазваляе гэта зрабіць прыгожа і належным чынам аформіць. У прынцыпе, такі падыход апраўданы. Я заўважыла, што за той час, які мы не працавалі, перавагі пакупніка трохі змяніліся: зараз людзі ўсё часцей імкнуцца купіць не асобны выраб, а падбіраюць камплект — завушніцы, пярсцёнак, падвесачку. Вядома, кошт пакупкі ўзрастае, але і чалавек атрымлівае зусім іншы выраб: у камплекце ювелірныя ўпрыгожванні выглядаюць больш выйгрышна, чым паасобку.

Загадчык маладзечанскай «Яшмы» лічыць, што праца абноўленага магазіна ўжо дае плён, але хутка пакупнікоў павінна стаць яшчэ больш — бо не ўсе жыхары бліжэйшых населеных пунктаў (Вілейкі, Смаргоні, Ашмянаў, Мядзела) яшчэ ведаюць, што «Яшма» ў Маладзечваюцца ў сталіцы, але да Маладзечна яшчэ дойдуць праз некалькі гадоў. Так, напрыклад, мы зрабілі фасад, які вентылюецца, выкарыстоўвалі італьянскія дэкаратыўныя тынкоўкі, якія якраз і дапамаглі дабіцца такога шыкоўнага выгляду, абавязковага для ювелірнай крамы. Мы ўжо чатыры гады працуем з такімі італьянскімі дэкаратыўнымі тынкоўкамі, і магу сказаць, што ніякіх хібаў мы не знайшлі — гэта вельмі надзейнае, якаснае і трывалае пакрыццё, устойлівае да пашкоджанняў.


Спецыялісты гандлёвага аддзела Таццяна ПАТАПЧЫК і Алена ІВАНОВА.



Падчас адкрыцця магазіна «Яшма» ў Маладзечне.


Запаветную чырвоную стужку праз імгненне пераражуць Уладзімір МІРГАЛОЎСКІ і начальнік аддзела гандлю Маладзечанскага райвыканкама Тамара МІКУЛІЧ.


А вось і першы пакупнік!

не зноў адчыніла свае дзверы пасля рэканструкцыі.

Нам таксама ўдалося пагутарыць і **з Іосіфам СОРКІНЫМ, дырэктарам ПУП «Юраміта»** — прадпрыемства, якое займалася рэканструкцыяй крамы «Яшма»:

— Мы там прымянялі самыя сучасныя матэрыялы, якія актыўна выкарыстоўваюцца...

«Юраміта», дарэчы, супрацоўнічае з «Белювеліргандлем» даўно — менавіта гэтая фірма праводзіла рэканструкцыю ў такіх мінскіх магазінах, як «Залаты пярсцёнак», «Аметыст», «Лазурыт», «Яхант», а таксама ў ювелірных крамах у Баранавічах і Лідзе. Іосіф Соркін адзначыў, што яны і надалей плануюць супрацоўнічаць:

— Усяго каля трох дзясяткаў магазінаў ужо рэканструявалі, а Уладзімір Міргалоўскі кажа, што яшчэ 10 трэба аднавіць. Усё зробім, без праблем. Бо сапраўды ювелірным крамам рэканструкцыя ідзе на карысць: напрыклад, пасля рэканструкцыі «Аметысту» тавараабарот у іх вырас у тры разы — тыя ж людзі, той жа тавар, а прадаваць сталі больш. Вось што значыць добрая рэканструкцыя з прымяненнем якасных і сучасных матэрыялаў!


Начальнік аддзела лагістыкі «Белювеліргандлю» Таццяна БАРАДЗІНА і дырэктар прыватнага ўнітарнага прадпрыемства «Юраміта» Іосіф СОРКІН.

## ФІРМЕННЫЯ КРАМЫ «Белювелірганддлю» па Беларусі:

**Мінск:**
- «Яхант» вул. Кісялёва, 28
- «Чараўніца» пр-т Незалежнасці, 13
- «Самацветы» пр-т Незалежнасці, 155, корп. 1
- «Аметыст» пр-т Незалежнасці, 83
- «Малахітавая шкатулка» пр-т Партызанскі, 42
- «Лазурыт» пр-т Ракасоўскага, 114
- «Біруза» пр-т Пушкіна, 67
- «Залаты пярсцёнак» вул. М. Танка, 34, корп. 1

**Брэст:**
- «Жамчужына» вул. Савецкая, 32
- «Смарагд» вул. Машэрава, 42

**Віцебск:**
- «Смарагд» вул. Кірава, 3
- «Лазурыт» вул. Замкавая, 4
- «Бурштын» вул. Чкалава, 1

**Гомель:**
- «Малахітавая шкатулка» вул. Перамогі, 18
- «Бярозка» вул. Перамогі, 18
- «Рубін» вул. Леніна, 12

**Гродна:**
- «Біруза» вул. Ажэшкі, 40
- «Аметыст» вул. Леніна, 24
- «Жамчужына» вул. Савецкая, 21

**Магілёў:**
- «Смарагд» вул. Першамайская, 67
- «Падарункі» вул. Першамайская, 67

**Салігорск:**
- «Малахіт» вул. Леніна, 47

**Кобрын:**
- «Алмаз» вул. Леніна, 15

**Наваполацк:**
- «Рубін» вул. Маладзёжная, 72

**Мазыр:**
- «Сапфір» вул. Савецкая, 126

**Ліда:**
- «Жамчужына» вул. Савецкая, 28

**Бабруйск:**
- «Бурштын» вул. М. Горкага, 7

**Маладзечна:**
- «Яшма» вул. Вялікі Гасцінец, 94

**Пружаны:**
- «Біруза» вул. Шырмы, 13

**Орша:**
- «Сапфір» вул. Камсамольская, 9

**Рэчыца:**
- «Алмаз» вул. Савецкая, 214(б)

**Ваўкавыск:**
- «Агат» вул. Жолудзева, 70

**Слуцк:**
- «Біруза» вул. Леніна, 197

**Баранавічы:**
- «Сапфір» вул. Леніна, 15

**Новалукомль:**
- «Рубін» вул. Набярэжная, 13

**Жлобін:**
- «Аметыст» вул. Першамайская, 45

**Слонім:**
- «Рубін» вул. Чырвонаармейская, 42

**Барысаў:**
- «Жамчужына» пр-т Рэвалюцыі, 19

**Пінск:**
- «Рубін» вул. Брэсцкая, 99

**Полацк:**
- «Тапаз» вул. К. Маркса, 9

ца, і мы з яшчэ большай радасцю сустракаем кожнага пакупніка, дорым усмешкі і імкнёмся данесці ўсю інфармацыю пра нашы ўпрыгожванні, дапамагаем зрабіць правільны выбар.

Наогул «Залаты пярсцёнак» спецыялізуецца на продажы заручальных пярсцёнкаў — іх асартымент тут, па словах Вольгі Канстанцінаўны, самы вялікі ў Мінску:

— Мы імкнёмся падтрымліваць і сам асартымент, а таксама, што немалаважна, і мадэльны шэраг — каб маладыя пары маглі адначасова падабраць сабе два пярсцёнкі, а не бегаць у пошуках па Мінску. Дарэчы, калі раптам няма патрэбнага памеру, але мадэлька спадабалася, то можна зрабіць заказ, трошкі пачакаць — і мы спецыяльна прывязём, — расказвае Вольга Андрончык і дадае, што яны адсочваюць асартымент вырабаў і стараюцца прапаноўваць пакупнікам самае моднае. — І цэны ў нас адпавядаюць асартыменту — на любы кашалёк: і для небагатых людзей, і для забяспечаных.

Пры гэтым Вольга Андрончык адзначыла, што добрым попытам карыстаюцца беларускія ювелірныя вырабы з-за добрага спалучэння цаны і якасці. Таксама яна расказала, што заходзяць у «Залаты пярсцёнак» і замежныя госці:

— Мы знаходзімся непадалёк ад цэнтра, таму да нас часта заходзяць і пакупнікі-замежнікі, часцей за ўсё з Кітая, Лівана, Турцыі. Моўных праблем, як правіла, не ўзнікае, англійскую мову на школьным узроўні ўсе мы ведаем, так што з яе дапамогай і з дапамогай жэстаў разумеем адно аднаго — замежныя госці выходзяць ад нас задаволеныя і з пакупкамі.

## «Чараўніца» — № 1 па асартыменце і якасці абслугоўвання

Дарэчы, калі больш падрабязна звярнуцца да ведання прадаўцамі замежных моў, то трэба звярнуць увагу на цікавы факт: зараз усе работнікі сталічнага ювелірнага магазіна «Чараўніца» актыўна вывучаюць англійскую мову. Што невыпадкова, бо гэтую краму можна назваць візітоўкай усяго «Белювеліргандлю» — яна знаходзіцца ў самым цэнтры сталіцы, на праспекце Незалежнасці, побач з атэлем «Мінск». Адпаведна, адбою ад пакупнікоў няма, у тым ліку шмат заходзіць і іншаземцаў — а ім, як і беларусам, трэба паказаць тавар, расказаць пра ўпрыгожанні, абавязкова нешта параіць.

**«Раней купляліся недарагія вырабы з золата, а зараз пакупнікі пачалі больш звяртаць сваю ўвагу на дарагія ювелірныя ўпрыгожванні з каштоўнымі камянямі — брыльянтамі, сапфірамі, смарагдамі»**

— Для нас арганізаваны курсы англійскай мовы, — расказвае **Іна МАРЫНІЧ, таваразнавец магазіна «Чараўніца».** — Да нас ходзіць выкладчык, закуплены кнігі і дыскі, прычым асноўны ўпор робіцца на спецыфіку нашай працы — на лексіку ювелірнай справы. Ужо зараз можна сказаць, што пэўныя поспехі ёсць: любы прадавец нашай крамы можа весці гутарку на англійскай мове з замежнымі пакупнікамі.

Вопыт курсаў па англійскай мове для прадаўцоў «Чараўніцы» першы для «Белювелірганддлю». Але, хутчэй за ўсё, ён будзе пашыраны і на іншыя фірменныя крамы, асабліва ў сталіцы, бо ў 2014 годзе Мінск будзе прымаць чэмпіянат свету па хакеі, чакаецца наплыў турыстаў, а значыць, трэба для гэтага падрыхтавацца загадзя.

Цікавы выпадак, звязаны з моўным пытаннем, адбыўся не так даўно ў «Чараўніцы»: у краму завіталі кітайцы і вырашылі нешта спытаць у прадаўца. І ўявіце, якое ў іх было здзіўленне, калі пачулі адказ... па-кітайску! Аказваецца, што прадавец «Чараўніцы» знаходзілася 6 месяцаў у Кітаі, дзе працавала з беларускімі сувенірамі на міжнароднай выставе «Экспа-2010» — там кітайскую мову трохі і падвучыла. Для кітайскіх гасцей гэта быў фурор, яны радаваліся як дзеці, калі пачулі ў беларускай ювелірнай краме сваю родную мову. Безумоўна, гэта яны расцанілі як павагу да іх саміх і да іх дзяржавы.


Так выглядае інтэр'ер сталічнага «Залатога пярсцёнка».




Наогул, краму «Чараўніца» дырэктар ААТ «Белювелірганддаль» лічыць самай важнай сярод іншых магазінаў:

— Я б хацеў акцэнтаваць увагу, што ў нас самы галоўны і самы важны магазін па рэспубліцы — «Чараўніца», які мае толькі гандлёвых плошчаў 360 квадратных метраў. Там размешчаны сапраўды практычна ўвесь асартымент ювелірных вырабаў, вялікая колькасць сталовага срэбра, а таксама сувенірная прадукцыя. Я лічу, што гэтая крама па тэхнічных і іншых параметрах адпавядае першаму нумару, бо і асартымент належны, і абслугоўванне, і персанал высокакваліфікаваны, які ведае сваю справу і ўмее працаваць з любімай прадукцыяй.

Па словах Іны Марыніч, сёння асартымент «Чараўніцы» складаецца прыкладна з 15 тысяч найменняў ювелірных вырабаў, з якіх залатыя і сярэбраныя маюць прыкладна аднолькавыя долі. Плюс да гэтага — яшчэ сувеніры, гадзіннікі і іншыя вырабы.

— У нашым магазіне попытам карыстаецца ўсё: няма такой адзінкі прадукцыі, якую б мы не маглі прадаць: месца добрае, людзей заходзіць шмат, таму распрадаём літаральна усё, — дзеліцца інфармацыяй Іна Аляксандраўна. — Добрым попытам карыстаюцца класічныя ювелірныя вырабы, упрыгожванні з новых калекцый, срэбраны посуд, павялічваюцца продажы сувеніраў і гэтак далей. Дарэчы, вельмі добра прадаюцца вырабы нашага гомельскага завода — цікава, што іншаземцы якраз-такі і стараюцца набыць які-небудзь ювелірны выраб беларускай вытворчасці: бо згадзіцеся, прыехаўшы з Расіі, набываць расійскае золата было б нелагічна, — лічыць Іна Марыніч.



**«Іншаземцы стараюцца абавязкова набыць які-небудзь ювелірны выраб беларускай вытворчасці»**

## У прадаўцы ювелірнай крамы бяруць самых прыгожых, ветлівых і... цярплівых!

У ювелірнай справе не бывае дробязяў — усё, пачынаючы ад знешняга выгляду крамы і да асартыменту прадукцыі, павінна быць на вышэйшым узроўні. У тым ліку — і персанал магазінаў, бо ад прадаўца таксама шмат залежыць задаволенасць кліента пакупкай.

— Прадавец часткова з'яўляецца і псіхолагам, бо ювелірная крама — гэта не булачная, куды пакупнік заходзіць кожны дзень і купляе сабе батон. У нашым жа магазіне кліент перад пакупкай можа памераць і 5 пярсцёнкаў, і 10, і 15, а можа наогул усе вітрыны абгледзець. Таму прадавец павінен з разуменнем ставіцца, цярпліва паказваць тавар, нават калі вы з пакупніком цэлую гадзіну нешта падбіралі, а ён набыў падвесачку за 50 тысяч, — лічыць Іна Марыніч. — Дзяўчыны, якія доўга ў нас працуюць, ужо могуць інтуітыўна падказаць нешта кліенту, дапамагчы з выбарам. Але я лічу, што пры гэтым не трэба быць надакучлівым. Дарэчы, людзі да нас пасля першай пакупкі прыходзяць яшчэ і яшчэ, асабліва тыя, што атрымалі дысконтныя карткі. Іх, як пастаянных кліентаў, мы ведаем «у твар», яны нам часта тэлефануюць, пытаюць пра новую прадукцыю, пра акцыі. Такім чынам, мы з імі фактычна маем не проста стасункі як пакупнік і прадавец, а нешта больш цеснае.







Іна Аляксандраўна расказала, што прадаўцамі ў ювелірныя крамы абы-каго не бяруць: звяртаецца ўвага на знешні выгляд дзяўчыны, на тое, дзе раней працавала ці вучылася. Пры гэтым вельмі добрым плюсам будзе, калі чалавек мае нейкія пэўныя веды ў ювелірнай галіне: пра каштоўныя металы, пра камяні — тады трэба менш часу марнаваць на іх навучанне.

На «Белювелірганддлі», дарэчы, упершыню ў рэспубліцы распрацаваны стандарт абслугоўвання, які ведае кожны прадавец. Такім чынам, любы кліент можа быць упэўнены на 100%, што да яго заўсёды паставяцца як да шаноўнага госця:

— Калі нашы прадаўцы будуць высакакласна абслугоўваць нашых пакупнікоў, то апошнія абавязкова вернуцца да нас яшчэ раз па новыя пакупкі. Зыходзячы з гэтага, мы спецыяльна распрацавалі стандарт абслугоўвання, зацвердзілі яго і давялі да кожнага прадаўца. Я лічу, што такі падыход правільны і ён дае свае вынікі, — пераканаы дырэктар ААТ Белювелірганддлю».

А каб самі прадаўцы магазінаў «Белювелірганддаль» былі зацікаўлены ў такой палітыцы ветлівасці і павагі да пакупніка, для іх створаны адпаведныя стымулы: у 2010 годзе па шэсць самых лепшых працаўнікоў паехалі на 10-дзённы адпачынак у Турцыю і Егіпет — вядома ж, за кошт прадпрыемства. Па выніках чацвёртага квартала 2010 года «Белювелірганддаль» спрацаваў добра, таму аналагічны падарунак да 8 Сакавіка атрымаюць яшчэ 10 працаўнікоў і змогуць адпачыць на моры.

Акрамя таго, па словах дырэктара, прадпрыемства пастаянна аказвае матэрыяльную дапамогу сваім працаўнікам да свят, дасылае паштоўкі з віншаваннямі да дня народзінаў і Новага года. Дарэчы, перад гэтым Новым годам «Белювелірганддаль» замовіў Дзеду Марозу павіншаваць сваіх працаўнікоў, і той разам са Снягуркай абыходзіў магазіны і ўручыў усяму персаналу (а таксама іх дзецям) салодкія падарункі.

## «Наша мэта — дарыць людзям радасць»

Адна з асаблівасцяў працы ювелірных крам «Белювелірганддлю» — гэта шырокі выбар любых катэгорый прадукцыі, у тым ліку і самых танных: вядома, прасцей было б прадаць адзін дарагі брыльянт з вялізнай нацэнкай у квартал, чым тысячу дробных сярэбраных упрыгожанняў. Аднак кіраўніцтва прадпрыемства лічыць, што найпершая задача «Белювелірганддлю» — задаволіць патрэбы грамадзян, а ўжо толькі потым — атрымаць прыбытак.

— Наша мэта — каб вы прыйшлі да нас у краму і парадаваліся, што можаце па абсалютна рэальных цэнах набыць ювелірныя ўпрыгожванні, якія вам падабаюцца, — падкрэсліў дырэктар ААТ «Белювелірганддаль». — Вядома, мы таксама не павінны быць стратным прадпрыемствам, але мы такім і не з'яўляемся. Проста ў нас няма пагоні за прыбыткам любой цаной — мы працуем перш за ўсё для нашых пакупнікоў, для нашых грамадзян.



Матэрыялы падрыхтавалі Павел БЕРАСНЕЎ, Алена ДАЎЖАНОК. Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

УНН 100129348.

